**Цэна асобнаго нумэру 5 кап.**

Год трэци. Вильня 18 (31) липня 1908 г. № 15.

Цэна з перасылкою и дастаукою да хаты: на 1 г.— 3 р., на 6 мес.— 1 р. 50 кап., на 3 м.—75 к., на 1 мес.—25 к. Без дастауки и перасылки: на 1 г.— 2 р. 40 к., на 6 м.— 1 р. 20 к., на 3 мес.—60 к., на 1 мес.—20 к. За границаю: на 1 г.— 4 р., на 6 мес.— 2 р., на 3 мес.— 1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

# Наша Нива

Першая Беларуская Газэта з Рысунками

**Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами**

Падписка прынимаецца и прадаюцца атдзельные: пумэры газэты 1) У Кант. „Нашай Нивы“ — Виленская вулица дом № 20, 2) У Книгарни „Знание“ — Георгиески праспэкт дом № 4 3) У Книгарни Литоуской М. Пясэцкой — Шлапэлис, Доминиканская вулица дом № 13.

Адрэс рэдакпии и администрацыи: **Вильня, Виленская вулица, дом № 20.**

Абъяуленя прынимаюцца на паследней страницы на 20 кап. за линейку малыми литэрами. Рукаписы и корэспондэнцыи, прысланные у рэдакцию, мусяць быць чытатэльна написаны з праудзивою фамильею и адрэсом таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падписаць прозвищэ разом з фамильею, хто незахочэ, каб была надрукована праудзивая фамилия. Адрэс и фамилия тольки для ведама рэдакции.

*Хто хочэ мець даход, прадаючы „Нашу Ниву“ увйосках, мястэчках и гарадох, нехай напишэ аб гэтым на аткрытцэ у Кантору нашай газэты.*

## Констытуция у Турции.

—о—

Вочы ўсяго сьвету цяпер зьвярнулися на Турцию: там абъяўлена констытуция.

Дагэтуль султан турэцки гаспадарыў ва ўсём гасударстви праз чыноўникоў сваих, як сам хацеў, не пытаючыся у народу. Яго ўласць трымалася на войску, каторае стаяло за султана. Але ў гэтых днях ў гор. Монастыры (ў Македонии) и салдаты, и афицэры ўзбунтавалися; да их з гадзины на гадзину стали прылучацца ўсё новые и новые палки па других гарадох. Гэтые паўстанцы —так-званые „младотурки“ трэбовали, каб ў Турции изноў была заведзена констытуция и парлямэнт (Дума) з народных выбарных, каторы даўнейшы султан скасаваў.

Цяперашни султан Абдул-Гамид так сама быў проци констытуции и спачатку хацеў у крыви затапиць рэвалюцию. Але як прыйшли весьци, што войска скрось ня хочэ стрэляць у братоў сваих и пераходзиць да „младотуркоў“,—тады Абдул-Гамид уступиў и абъявиў, што дае старую констытуцию и парлямэнт.

Што будзе далей: ци султан цьвёрда стрымае свае слова, ци можэ зробиць так, як шах пэрсицки, каторы даў парлямэнт, а потым разагнаў и разстрэляў яго с помачью рускаго палкоўника Ляхова,—ешчэ нима ведама. Пажывем — пабачым. Цяпер тольки можна сказаць, што адгэтуль ва ўсей Эўропи ня будзе такога гасударства, гдзе бы народ ня меў парлямэнту и констытуцыйных парадкоў, хаця свабода ешчэ ня ўсюды роўная. Скора и Китай зьбираецца завесьци констытуцию.

## Работы камисий Трэцяй Думы.

—)-(—

Як ишла работа на заседаньнях Думы, гэта знае кожны, хто акуратне чытаў атчоты аб их. Але-ж трэба сказаць, што праца Думы не канчалася на заседаньнях: па-праўдзи, найважнейшая работа адбывалася ў камисиях думских. Кожны новы закон, кожнае важнейшае пастанаўленьне Думы перш-наперш разбиралося ў камисиях; тады камисии рабили „даклад“ на заседаньни Думы, и пасьля гэтаго тольки Дума зацьведжала або адкидала тые законы. Паглядзим-жэ, як працавали и што прыгатавали ўсе думские камисии за восем месяцоў жыцьця Думы.

Ўселяких камисий ў Трэцей Думе было не мала, бо аж 31. А як людзей, здатных да такой вяликай и цяжкай работы, ў гэту Думу папала не лишне многа, дык прышлося найбольш здольных и мудрых выбираць адразу ў тры, чатыры, або и ў шэсць камисий. Ня дзива, што ў таким прыпадку праца камисий не магла исьци саўсим добра.

Дый тольки палова камисий за ўвесь час и здалела прыгатаваць и падаць Думе дзе-якие законы. Але ў гэтай шчасьливай палови нима тых, што павинны апрацоўваць законы аб повых парадках и аб палепшэньню доли народу.

Гэтак камисия *аб зямельнай справе*, ў каторай было 66 дэпутатоў, праз сем месяцоў разабрала тольки адзин закон аб выдзеле з „общчыны“, каторы завяло правицельства; вяликаго значэньня для нашаго краю гэты закон ня мае, бо ў Беларуси мала гдзе ёсць „обшчына“, а ўсё больш земля належыць да асобных гаспадароў на ўла-

снасць. На гэтым и скончылась праца зямельнай камисии.

Изноў ешчэ 22 листапада (ноября) 1907 г. Дума выбрала *рабочую* камисию. Ў ей было 33 дэп.; прадседацелем быў акцябрыст барон Тизэнгаўзэн. Яна разглядзела праект закона, каб за калецтва пры працы рабочым казённых заводоў и фабрык плацили бы грошы на жыццё, и ў дакладзе сваим прасила Думу такога закону не зацьверджаць. Дакладу Дума не разгледзела, и камисия ўзяла яго назад. Вось и ўсё, што рабочая камисия зрабила праз сем месяцоў.

Камисия аб *чыншэвикох* зьбиралася ўсяго тольки *адзин раз*, дый на гэтым заседаньни — першым и астатним—пастанавила зьбираць ведамасьци аб чыншу. А для нашаго краю справа аб чыншэвикох, каторых ўладзельцы зямли могуць цiснуць, як хочуць, надта важная. Беларусь ждзе не даждзецца новых законоў, каб палажыць канец крыўдам и несправедливасьци.

Каб разабраць пытаньне аб тым, каб павиннасьци, што адбываюць адны тольки мужыки, разлажыць роўна на ўсих (на памешчыкоў и других), была так сама выбрана асобная камисия. Яна признала, што тую справу можна будзе скончыць тады, як пойдзе перастройка ўсих валасных парадкоў, а покуль што ничога зрабиць ня можна.

Камисия *аб гандлю и фабрыках* надумала аткрыць ў гор. Сосновицах двор, куды пpыганялибы сьвиней... Камисия *проци пьянства* написала закон, каб на бутэльках з гарэлкай были новые наклейки, каб давали награду кожнаму, хто аткрые патайны шынок, каб забараниць прадажу гарэлки ўсюды, апроч гарадоў, и т. д. И яна, здаецца, цьвёрда верыць, што гэткими способами можна саўсим вывесьци пьянства...

У пачатку грудня правицельство падало ў Думу закон *аб свабодзи ци нетыкальнасьци асобы кожнаго чалавека* („неприкосновенность личности"). Закон гэты аддали ў камисию. Яки ён быў, то быў: воли залишне многа не даваў; але-ж камисия, папрацаваўшы над им месяц, так яго перапpавила и урэзала, што нават „правые" абидзились и назвали яго „цёмнай справай". Маклаков сказаў, што гэта адзин сорам, а дэп. Гучков, глаўны камандзер акцябрыстоў, радзиў Думе не прымаць саўсим гэтай работы камисии. Гэтак з папpавак камисии ничога ня выйшла. Больш мала яна зрабила.

Цяжка йшла работа и ў камисиях аб справах рэлигии, аб праваслаўнай цэркви, стараверах. А была выбрана ешчэ и такая камисия, што якбы саўсим прапала негдзе: гэта *кантрыльная* камисия. Заданьня яе вельми важные: яна павинна рабиць кантроль росписи расходоў и даходоў гасударственых ды глядзець, каб народные грошы йшли на тое, на што празначэны. И гэтая камисия ничагусенька не рабила ўсе восем месяцоў! Аб работах яе нихто ничога ня чуў...

Невясёлы абраз...

Кажуць: „якое дрэва, таки клин".—Якая работа камисий, такая—можна наўперад сказаць—будзе и работа Думы.

Хто ва ўсём гэтым винаваты—ци дэпутаты, ци народ сам, што выбираў их, ци хто други, — аб гэтым цяпер гаварыць ня будзем. Скажэм тольки, што як и далей ўсё будзе гэтак сама исьци, як дагэтуль, то найважнейшых для ўсяго народу законоў и парадкоў прыдзецца ешчэ доўга чакаць....

---

## Канец заседаньнеу Гасударст. Савету.

Па манифэсту 17 акцябра 1905 года ниводзин закон ня можэ мець силы, покуль яго не зацьвердзиць Гасударственая Дума. Але ж изноў пастанаўленьня и законы, каторые пишэ Дума, каб мець силу, мусяць перш исьци ў Гасударствены Савет и, як там их прымуць тады ўжо да подпису Гасудара.

Ґэтак рабилося и з усеми законами Трэцей Думы, ды не заўсягды Савет згаджаўся з Думай. Напрыклад, Дума пастанавила, што на новые ваенные карабли министэрству марскому грошэй (11 мильёноў руб.) даваць ня можна; тым часам Савет не прыстаў на гэта и даў свой саглас на той выдатак. Так сама бывала и з иншыми справама: Савет, як казаў дэп. Гучков, ахвотне зацьверджаў тое, чаго хацела правицельства, а не Дума.

Работа Савету йшла слабавата: часта на саўсим дробные справы трацили залишне многа часу, а на такие важные и вяликие рэчы, што над ими Дума працавала па дзён кольки, Савет звертаў саўсим мала уваги, ды разбираў без доўгай гутарки и спороў ў некольки гадзин. Гэтак было, як разгледали расходы на министэрства народнай прасьветы, ваеннае и др.

Ў Гасударственым Савеци, як ведама, палова членоў выбираецца багатшыми жыцелями Расеи, а другую палову назначае правицельства — ўсё вяликшых чыноўникоў. Дык ў Савеци ёсць найбольш „правых", и яны кируюць ўсей палитыкай. Ня дзива, што, як пишэ „Рѣчь", „ўсе думки аб культурнай рабоци заглушались, кали хоць трохи были падобны да жаданьнёў *прогрэсистоў*".

5-го липня было астатняе заседаньне Гасударственаго Савету. За гэты адзин дзень зацьвярдзили 44 невяликие законы. Ўсё-ж таки выходзиць, што Савет не пасьпеў разабраць шэсць законоў, разгледжэных ў Думе; ў тым шчоци ёсць и закон аб выпушчаньню с турмы арэштантоў раней тэрмину адседки. — Ў канцы заседаньня сказаў мову прадседацель Акимов. „Трэба прызнацца,—гаварыў ён—што працай нашаю над новыми законами зроблена мала што...."

Пасьля прачытали Царски Указ аб закрыцьцю Савету на лета да 15 акцябра. Ў восени, значыць, заседаньня Савету пачнуцца изноў адначасьне з Думою.

---

# На летни адпачынак.

Тольки што прэдставицель правицельства скончыў чытаць аб роспуску Думы на „каникулы" (летни адпачынак), як сярод „правых" дэпутатоў пачуўся нечы здушэны плач. Плакаў мужыцки дэпутат.

Усе ўстрывожылися.

Дэпутата кинулися уцешаць.

— Чаго ты? гэта-ж не на саўсим, а тольки на лета закрываюць. У восень зноў прыедзем сюды.

— Ваша высокаблагародная сьветласць, пан финансаў,—ўзмалиўся дэпутат: — дазвольце мне тут астацца!

— Гдзе тут?

— Ў Думе, ў гэтай. Я-б тут у куточку прымасьциўся и жыў бы пацихэнечку... Зрабеце боскую ласку...

— Да на што вам гэта?

— Добрые паны! або яны людзи? Яны — зверьё!

Прадседацель, як чалавек спрытны, дагадаўся першы, чаму дэпутату страшна паказацца ў вёсцы.

— Не с пустыми-ж руками паедзеце вы да сваих мужыкоў—сказаў ён.

— Хавай Божэ! Дзе ўжо тут с пустыми!? Гасьцинцаў накупляю—нехай лопаюць.

— Я не пра тое... Вы павязеце мужыком многа радоснаго. Ласьне Дума так-таки ничога и не зрабила для мужыкоў?

Дэпутат разьвесиў вушы.

— А што-ж яна зрабила?—спытаў ён.

— Рубель!—падсказаў нехта злева.

— А хоць бы и рубель! — падхопиў прадседацель. Вытлумачце мужыком, што мы, бароначы их справы, зьбили шчот аднаго министэрства на рубель. Ў мужыцким абыходку гэта—багацтва!

— А тут астацца мне так и ня можна? Я-б им потым написаў, што мяне аставили глядзець за парадками ў Думе. Нияк ня мог выбрацца. Так и написаў бы им...

Просьбу дэпутата с. Безбрухаго паставили на галасованьне.

Левые правалили.

* * *

Дэпутат с. Безбрухаго сядзеў ў сваей хаци и аплетаў пшэнную кашу. Кале стала стаяла маци и, уцираючы сьлёзы, гаварыла:

— А як гэта беднай матцы!.. Нешчасны ты мой!

— Ня муч ты майго сэрца, матка! Ци-ж я таки безпанятны? Скажу им сягодня, што и як... Ци абъяўлена, каб зьбиралися на выгани?

— Ешчэ з ранку.

— О-о-ох!

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Дэпутат падышоў да грамады выбаршчыкоў и, узлезшы на бочку, зирнуў на их мутным вокам.

— Гаспада народные прэдставицели!—пачаў дэпутат:—ёсць у вас яки-нибудзь „кворум“ (личба дэпутатоў, пры каторай заседаньне ў Думе мае силу закона)?

— Ты тут не дуры галавы! Кажы толкам!— загули мужыки.

— Дбаючы аб вашы справы, за ваш грош я стаяў гарою. Вось, к прымеру сказаць, пан министэр просиць грошы на карабли—броненосцы, каторые плаваючые... Што-ж вы думаеце—я? Так и адвалиў? Наце, вось, бярыце? Хо! не на такоўскаго папали... „Як, — кажу, — нашым мужыком кожны рубель замеж тышчы, то ци не адъедзеце на абрэзаным рахунку?“

У грамадзе зарагатали.

— Спрытна ты гэта яго.

— Маладчына!!

— На многа-ж ты яго абрэзаў?

— Многа ня многа, а рубель адцяг!

Ядавиты мужык Сапун вышаў з грамады и сказаў:

— Гэта на ўсю працавитую беднату?

— Цёмны народ вы! На рыла гэта па рублю прыходзицца!—крыкнуў други мужык.

Дэпутат саўсим зьбиўся.

— К прымеру, скажэм, ты, Сапун, або ты, Янка Кудлаты,—вам жэ рубель ў гаспадарцы оей як патрэбен!

— Дзива што! Куды тут без рубля! —

— Дык вот. А я вам гэты рубель и аставиў.. Вось ён, братки, яки ваш дэпутат!

Грамада прыветна загула. Рубель так задабрыў мужыкоў, што другие пункты адчоту прашли саўсим шчасьливе для дэпутата.

Сходка разышлася.

Тольки што дэпутат стаў минаць агароды, як пачуў ззаду тупат. Яго даганяў Янка Кудлаты.

— Табе чаго?

— Давай мой рубель!

— Што ты, варъят! яки рубель?

— Каторы ты адабраў ад министра.

— Галава з мазгами! гэта я так казаў, к прымеру.

— К прымеру там, ци не к прымеру, а мне мой рубель аддавай!

— Чэрци вы безпанятные! Ци-ж гэта я для цябе палучаў?

— А! дык ты гэтак?!...

Янка Кудлаты расправиў пукатые плечы и наплеваў на руки.

— Пачакай! И пажартаваць ня можна! На табе твой рубель...

Кудлаты аглядзеў рубель, куснуў яго зубами и панесся далей.

Дома дэпутат тольки што прысеў да збана з малаком.

— Хлеб соль!

На парози стаяў Сапун.

— А я, брат, к табе за падмогай. Рубель той, што недаўна дэклараваў ты...

Дэпутат схапиўся за галаву и стаў тлумачыць Сапуну.

Сапун ўсё киваў лысаю галавою.

— Так яно то так. Вядома, вам там з гары видней... А кали ты дэклараваў пры людзях рубель, то аддай. Адказацца, брат, грэх. Грошы у нас личэные.

Дэпутат плюнуў и са злосцью кинуў Сапуну рубель.

* * *

Праз гадзину цэлая грамада мужыкоў и жонак акружыла хату народнаго збранника. Сам ён схаваўся, зачыниўшы дзьверы. А да яго ламалися ў дзьверы выбаршчыки, крычучы:

— Круцель, каб табе лопнуць! Людзкие грошы не атдаеш. Па рублю адпушчэна на ўсих мужыкоў, а ты на двух хочэш выехаць?! Ламай яму, чорту лысаму, дзьверы, хлопцы!!...

Написаў **Ар. Аверчэнко** (ў газ. „Утро“).

На беларускую мову ператлумачыў

**Стары Слонь.**

## Развейся, туман....

Развейся ,туман, расплывицеся, хмары,
Над хатай пахилай маей!
Хай сонцэ прагляне, хай цяжкие мары
Ня мучаць душы и грудзей...

Штось кликало рваца и выжэй, и далей,
На лепшае звало жыцьцё.
Вы, злые туманы, вы, хмары без жалю,
Закрыли, забрали мне ўсё...

Стаю и гляджу я на хату крывую,
На ниву пустую сваю —
И слёз не стрымаю, и циха бядую,
И нудную песьню пяю;

И к небу малюся, ў жыцьцё загледаю,
Ци моц скуль якая ня йдзе? —
И цёмна, и нема ад краю да краю,
Ни сьвету, ни сьледу нигдзе...

Ни сьвету, ни сьледу... марнуюцца силы,
Дух праўды и воли прыгас;
Нядоля и горэ, навокол — магилы, —
Вось роднаго шчасьця абраз....

Янук Купала.

# Аб усём па троху.

## Што цяпер рабиць гаспадаром.

Есць у гаспадарцы такие работы, што прапусьци дзён кольки, то и работа ня спорна, и карысьци з яе мала.

Цяпер надходзиць час аднае такой работы: гэта час падгараць жытнишчэ там, гдзе на вясну прыдзецца бульба ци гарох.

Падгаране робицца за тым, каб дзерно жытнишча згнило барджэй, каб зельле, якое гдзе ёсць, пачало расьци и перад зимкай яго можна было ешчэ зглумиць бараною. Тады пад гарох ци бульбу поле чыстае будзе. Каб дзерно згнило, трэба, каб яго вецер перэймаў. Завали яго глыбока—яно и не перапрэе. Падгорываць трэба сахой ци плугам плытка - плыценька—цали на два, абы дзерно зрэзаць и перэвярнуць. Рабице гэта ўраз-жэ па жниве, хоць бы копы ешчэ стаяли на поли, бо пад жытам земля мягкая, вильготная, а, пажаўшы жыта, высахне, скаменее. Што падгарэш сьвежаго ржышча за дзень, таго, пачакаўшы нядзелю, за два дни падгараць не пасьпееш. —Кали падгарэш сьвежае ржышчэ—вильготнае, то, гдзе было ў зямли якое зернятка зельля, яно борзда пусьцицца расьци; тут яно и пападзе пад барану. А высушы ржышчэ не гараўшы,—зернята перазимуюць и вырастуць у цябе ў бульбе ци ў гароси. Так сама пырэй на падгараным поли вельми ёмка вытрасае барана.

Падгараўшы цяпер и выбаранаваўшы, як скрышыцца дзерно, можна з восени ешчэ вывесьци и загараць гной пад бульбу ци пагараць пад гарох. Тады з вясны шмат раней и бульбу пасадзиш, и гарох пасееш, а ўжо ведама: што ранняя сеўба, то ня позная.

Тройца.

## Як рабиць прыгаворы аб закрыцьцю манаполек.

У апошние годы то тут, то там, гдзе народ сьвятлейшы, пачали людзи ваеваць з найгоршым с-памеж нашых ворагоў—з пьянствам. Вось жэ па некаторых вёсках Виленскай и других нашых губэрний мужыки писали прыгаворы, каб у их закрыли манапольку, бо покуль гарэлку можна дастаць у сябе пад бокам, датуль и пьянства саўсим вывесьци нельга: пакуса залишне вяликая. Але прыгаворы писалися, а манапольки як стаяли, так и стаяць на сваим мейсцу: прыгаворы зроблены были не па закону.

Цяпер виленски губэрнатар растлумачыў земским начальником, што па закону 26 юня 1896 г. маюць силу тольки такие прыгаворы аб закрыцьцю манаполек, ў каторых будзе *ясна написана*, што мужыки хочуць *забаранить прадажу гарэлки не у аднэй манапольцы, а саусим—усе роуна, гдзе-бы яна ни прадавалася.* Пры гэтым мусиць быць паказана, што робицца гэта за тым, каб да званьня вывесьци пьянства, а не таму, што мужыки працивяцца самай манапольцы, або катораму-небудзь гандляру гарэлкай.

Нехай-жэ тые вёски, што пазнали добра, кольки бяды и гора робиць им гарэлка,—пишуць прыгаворы свае па гэтаму закону, трымаючысь канечне аписанаго тут парадку. Иначэй ничога з их прыгавороў ня выйдзе.

## Новы парадак выдаваньня пазычэк з „крэсцьянскаго банку“.

Выйшоў новы закон аб прадажы мужыком зямли, ў каторым пишэцца вось што.

Кали зямлю хочэ купиць вялыкая грамада мужыкоў — сельскае обчэство ци товарыство больш як з дзесяти хат, тады банк будзе даваць пазычку ня болей 80 працэнтоў ацэнки (—значыць, каб на зямлю, што варта 100 руб., прыходзилось ня больш 80 руб. пазычки). Можна пазычку павеличыць да 85 працэнтоў, кали обчэство купляе зямлю сумежную, што ўходзиць клинам меж шнуры вёсковые, або канечне патрэбны лес, сенакос, пашу ци што иншае. Гэтульки пазычаць будзе банк и тады, як зямлю—ўсё роўна якую—купляе обчэство ци товарыство ня больш, як з 10 хат.—За тое асобным гаспадаром, што купляюць зямлю кожны сабе, можна выдаваць пазычки да 90, 95 и нават 100 працэнтоў ацэнки (—значыць, близка або и акурат гэтульки, як земля варта).

Кали хто захочэ пабиць свой маёнтак на дробные фольварки (хутары) и распрадаць их мужыком, то па новаму закону землеустраицельные камисии павинны даваць сваих землемероў и рабиць ўсе работы казённым коштам. Гэтак памешчыком лягчэй будзе прадаваць сваю зямлю.

# Жниво.

*(Весковым работницом).*

Рэдкае збожэ, травы палавина;
Колас ня гнецца зярном да зямли.
Знаць, несчасьлива была то часина,
Як кидали зерне сяўцы па ральи.

Вышли на поле вось жнеи с серпами
Ў лапцях лазовых, а хто без лапцей, —
Нива пустыми шумиць каласами,
Нива ня цешыць жаноцких вачэй!

Цяжка ўздыхнуўшы, збаны пастаўляли,
Клунки на межы паклали жнеи.

Бабы старые свой твар пражэгнали,
Циха за працу ўзялися дзяўки.

Горача ў поли! Эх, жар дакучае,
Праца марудна, без конца цяжка!...
Сьпину и плечы им боль адбирае,
Аж дзервянее у жнеек рука.

Збэрсано жыто, чэпляецца колас...
Жменя нажата, разгнецца жнея,
Жыто паложыць на скручэны пояс;
Цяжкая, жнейка, работа твая!

Циха на поли ў палудзень гарачы!
Хоць бы гдзе кусьцика рэдкая цень.
Тольки ў калысцэ плач чуеш дзицячы,
Нудна над вухам зьвиниць авадзень....

**Якуб Колас.**

# З Беларуси и Литвы.

(Ад нашых карэспандэнтоў).

Летась ў м. **Зембине** Барыс. пав. Минск. губ. адкрылася з выдумки Б. Свянцицкаго и с падмогай некаторых мужыкоў, паноў и шляхты гаспадарская суполка. Спачатку на перших двух сабраньнях зьбиралася шмат народу; записалася ў супалку 70 чалавек. Але ўжо на трэцим заседаньню ни прадседацель, ни памоцник яго не зьявилися, бо у нас людзи не прывыкли старацца для грамадзких спраў и грамадзкай карысьци. Таки ўжо цёмны край наша Беларусь.—Вось и суполка якбы памерла. Але пазьней прадседацель неяк ачухаўся, сход сабраўся ў восень, скинуў старога памоцника и выбраў новаго байчэйшаго; дый работа закипела.

Ўпярод „кружок" збираўся ў плебании; цяпер супольники наняли цэлы дом на бойким мейсцу, ў самай сярэдзине мястэчка Суполка выписала 18 вагstation ў жыта з Сыбиры и Палтаўскай г.; жыта прадавалося ў 6 месцох па 1 р. 18 кап. за пуд,—шмат танней и лепшае за тое, што выписала земства. Каб ня гэтае жыта, бедным дрэнна прышлося бы, бо у нас быў слабы ураджай летась, и сядзели мужыки бяз хлеба.—Изноў суполка выписала вагон л у б и н у, каторы разабрали на станции ў Барысави супольники, што падписалися на гэты лубин. Суполка сабираецца адкрыць сельски банчок, каб магли людзи пазычаць грошы за невялики працэнт.

Сёлета вясной адкрыўся пры зембинскай суполцэ склад машын и ўсякай прылады да гаспадарки; тут можна знайсьци плуги, бороны, малатарни ручные и конные, арфы, млынки, сечкарни, косы, вилки, цьвяки ўсякай формы, цэнтрафуги. Прадаюцца на складзе тавары пакуль-што за гатовые грошы, на павер не даюць. Пазьней, як суполка набагацее, будуць даваць и на павер. Цэны на ўсё справядливые, без ашуканства тавар. Некаторые супольн. хочуць, каб прадавалися там и харчы.

Дзякуй тым, што працавали и працуюць над гэтай суполкай и складам хаўрусным. Народ дагэтуль сядзеў ў цемнаце и прыциску, и надта цяжка злучаць яго ў хэўры, суполки; нима на гэта ешчэ практыки. Хаця такими суполками народ шмат можэ палепшыць жыцьце. Па ўсих других царствах мужыки даўно ўжо пазлучалися ў суполки и не разумеюць, як гэта можна мужыком жыць не ў дружнай грамадзе. Вось, напрыклад, ў немецким гасударстве ёсць 25 тысяч 714 суполок, а ў Италии адных тольки малочных суполок 800.

**Банадысь.**

М. **Гайна** Барысоўск. пав. Минск. губ. — Ў нашай ваколицы пасьля леташней неўроды цяпер саўсим нимашака хлеба. Некаторые мужыки цэлы год хлеба не каштавали и жывилися тольки ци праснаками, ци пахлебкай. Хоць жниво недалёка, а мука жытняя каштуе дзесяць злотых (1 р. 50 к.) за пуд. Пасевы жытние и яравые блищчали трохи лепей процiў леташних, але за апошни час стали часта прахадзиць буры з градам и пярунами, ды шмат гдзе многа шкоды зрабилося: град паадбиваў збожэ, ў адным мейсцу пярун забиў двое кони. А вось нядаўно ў Лошницкай воласьци аж шэсць вёсак вельми пацярпела ад страшэннаго урагану, каторы разгуляўся больш як на 60 верстоў, зруйнаваў шмат дамоў, павырываў с корнями многа дзярэў; град знишчтожыў на поли ўсё чыста, пабиў жывёлу; градзины были небывалай вялiчыни.

Зямли у наших мужыкоў мала, ды у нас и каля нас яна цяжкая, гарыстая и камянистая; родзиць дрэнна, кольки бы працы ни ўлажыў, и ня помним такога шчасьливаго здарэньня, каб хлеба хвацила на круглы год. Вось и цяпер нашы галодные хлебаробы са страхам думаюць аб недалёкай зиме и прадвесьни. **Янка с-пад Гайны.**

М. **Янушковичы** Барысоўск. пав. Мин. г. — Ня вельми даўно недалёка ад Янушкович павесилися двое невядомых маладых людзей. Чаму яны павесилися, трудна даведацца. Адзин тольки з их прад гэтым хадзиў и шукаў якой службы, заходзиў ў суседние двары и прасиў работы, але яго нигдзе не пpыняли. Вось, як видаць, чалавек той меў замнога суменьня, каб пайсьци з голаду на злодзейства ци разбой, и таму налажыў на сябе руки. А людзи... што-ж людзи?—ведама, и не падумали памагчы галоднаму и безработнаму... Можэ и другога такая самая нядоля загнала ў пятлю.—А шкода маладых людзей—прапали за ништо, хоць можэ с часам выйшли бы з их слаўные грамадзяне, суменные и карыстные для краю. Праз кавалак хлеба, кусок чорнаго и горкаго хлеба гинуць бедаки, як тые мухи... **Той самы.**

С. **Корэнь**, Гайно-Слабодзкай воласьци, Барысоўск. п. Минск. г.—У нас 6 липня были закладзины новаго вучылишча. Адслужыў малебен тольки праваслаўны поп. Каталики жаляцца, чаму и ксёндз потым не адправиў набажэнства, бо будуць ў той школи вучыцца и каталики. Па других мейсцох заўсягды ксяндзы и папы ўсих рэлигий правяць набажэнства адзин пасьля другога.

**Невядомы.**

Каля **Навагрудку** Минск. г. ёсць кольки вёсак невяликих, як напрыклад **Молнеч, Малысялок;** людзи некаторые тут заможные и досыць интэлигентные; два гандлюють лесам. Кепска тольки, што розные Сымоны гандлююць гарэлкай, и беларусы прапиваюць грошы ды губяць здароўе. Нехай бы мужыки зрабили прыгавор, каб нихто не гандляваў гарэлкай. **Сусед.**

**Барысоу, Минскай губ.** (праўдзивае апаведаньне перасяленца).

Ў нашым павеце ў Бытчанскай воласьци з вёски *Кобыльшчызна* выехали летась сем гаспадароў ў Сыбир ў хадаки, там яны выбрали сабе вучастки, каторые перасяленчэскае начальства за ими зацьвярдзила. Вярнуўшыся сярод лета дамоў, сабраушы усё с поля и с пожэнь, пачали па троху распрадаваць усю худобу: папрадавали зямлю, ха-

ты, скацинку и усё, што не магли вязьци ў Сыбир. И так рашыўшы сваю гаспадарку, сёлета вясной, ў канцы марца месяца, выехали ўсе сем семействоў ў вяликую дарогу. Не мала яны бяды працярпели, пахавали дарогай палавину дзетак, ў надзеи, што, прыехаўшы на новае мейсца и сеўшы на лепшую зямлю, станець лепей жыць; аж трэба прыдумаць, як яны здзивилися, прыехаўшы на выбранае и назначэнае им праз начальства мейсцэ, яны знайшли там других людзей, каторые их не пусьцили, бо перэселенчэская канцэлярыя аддала им гэтые вучастки, ня гледзячы на тое, што перш тые самые вучастки были адзначэны Кабыльшчанами. Ня маючы больш ничога да работы, нашы бедные парасяленцы пайшли да тамтэйшага начальства дабивацца сваих вучасткоў, але скольки ни хадзили па канцэлярыи — ничога не памагло. Набралися бедные гора, дабивалися болей месяца да начальства, пражыли апошние капейки; им адказали, чаму так позна прыехали? трэба было летась прыезджать! Ниякое тлумачэньне не памагло, ни тое, каб летась к зиме прыехали, то не было б як жыць, што ў далёкую дарогу з малыми дзяцьми выправицца проциў зимы страшна.

Але усё-ж потым перасяленчэскае начальства змилавалося и назначыла Кабыльшчанам другие вучастки; падзякаваўшы, нашы беларусы, не ўважаючы, што кишэни ўжо были пустые, пусьцилися ў дарогу на новые мейсцы, але тут земля была куды пушчэйшая: або моховае балота, на каторым рос тольки багун, або жвираватая, а часами навэт скалистая саўсим дрэнная земля. Небараки абгледзеўшы акуратно сваи вучастки и зьмяркаваўшы, што на гэтай зямли ў мильён раз горш жыць, як дома, а прытом апаражниўшы кишэни мусили варочацца дамоў, але гдзе-ж дома дзецца; прадали за бэзцэн рэштки худобы; и цяжкай абратнай дароги, яны прыехали ў родны край; але тут новая беда: землю прадали, ци аддали ў арэнду, хат нима, скацинки ниякой, лайна (бялизны) нима, грошы праездзили и прахарчэвали; прышлося садзицца кутам, аднаму у швагра, другому ў тэсьця, трэцему у свата, чацьвёрты пашоў на службу, аставиўшы бабу кутам без хлеба и адзежы ў чужой хаци; цяпер и службу сярод лета трудна знайсьци, па дварох панабирали людзей, па фабрыках и так поўна, ды семянистых на фабрыки не прыймаюць, и ўсё беда, беда, адна за другой. И вот цяпер бедным Кобыльшчанам, пагараваўшы, патрациўшы дзетак, зямлю-бацькоўшчыну и усю худобу, прышлося вярнуцца ў родны край саўсим убогими, прападаць з голаду и абцираць чужые пароги.

**„Банадысь“.**

М. **Гарадок** Виленск. губ. Вилейск. п. Памёр без пары пасьля цяжкай хваробы малады ешчэ чалавек *Антось Карницки* з Петроўшчыны. Нябошчык быў супрацоўникам „Нашае Доли“ и „Нашай Нивы“ и моцна ўсим сэрцэм стаяў за беларускую справу. Вечны пакой добраму таварышу и шчыраму грамадзянину!

М. **Хаценчыцы** Вилейск. пав. Вил. г.—Недалёка ад нас купцы (жыды) сякуць лес ў маёнтку Трусэвичы. Для нашай беднаты вёсковай кожны заработак добры, дык людзи рады, што хоць крыху могуць зарабиць тутака. Але-ж беда, што нехта завёў тут небывалую моду: як прыходзиць расплата, дык с кожнаго рубля, зарobленаго мужыком, купец затрымывае сабе пяць капеек, и гэта робицца без усякай розницы, ци хто працаваў за сходную, ци за несходную цэну. Куды и каму гэтые грошы идуць,—ня ведаем; а тольки крыўда бедаком дзеецца вяликая. Кольки ни працуй, кольки ни старайся, а ўсё роўна замест рубля атрымаеш тольки 95 кап., а кали зарабиў 50 руб., то дадуць тольки 47 руб. 50 кап.—Таки вышчыт называецца у нас „лаза“.

Даўней были так-званые „хвастки“: гэта значыць, кали мужык завёз на берэг к рэчцэ вельми грубое бервяно, то яму купец апроч платы даваў селедца и булку. А цяпер, бач, шыварат на выварат: цяпер ужо купцы бяруць „хвастки“ ад мужыкоў! Дый им „хвастки“ выходзяць лепей, як мужыком: купец бярэ с кожнаго дрэвасека ня булку, а добры куль пшэннай муки, и не селедца, а добра выкармленую сьвиню...

И малому дзицяци ведама, што расейски рубель трымае ў сабе 100 кап., а не 95, як хочуць купцы. Дык пара палажыць канец гэтаким ашуканским парадком. Мужыки-ж самы баяцца ўзяцца за гэту справу, каб саўсим не страциць работы або каб не прызнали их за бунтаўшчыкоў.

**Дрэвасек.**

М. **Батурыно** Вилейск. п., Вил. губ. На Петра тут быў кирмаш. Народу было ня мала, а гарэлки, як гэта у нас водзицца, ешчэ болей. Не абыйшлося ў таким разе и без шкандалу. Было гэтак: някий чалавек з Краменца купляў нешта ў крамцы у жыдоўки Нохимихи, ды нешта не паладзили и пачали спрэчацца за грошы; за Нохимиху заступиўся Нохим, а той чалавек ўдэрыў яго па твару. Тады другие жыды кинулися бараниць Нохима, а за мужыка ўступилися мужыки, и пайшла битва. Аж вось жыды паўцекали. Тут мужыки пачали зништажаць ўсё дабро Нохима и хацели збурыць краму яго, але не здалели. Пры гэтым вурадник перaписаў з дзесяць чалавек, и будзе суд. — Хто ва ўсём гэтым больш винаваты, трудна сказаць; але, як я ўсё бачыў сваими вачыма, дык мне здаецца, што найболей винаваты тые „кварты“ и „поўкварты“, каторых мужыки шмат апаражнили.

**Батурынец.**

М-ко **Ворняны,** Виленск. губ и пав.—У нас тут граница беларусоў и литвиноў; нашы литвины умеюць добра гаварыць па-беларуску. Старые меж сабой гаворaць ешчэ па-литоўску, а маладые литвины ўжо па-беларуску. Жывуць и беларусы и литвины, як браты; некаторые ўжо ня могуць разабраць, ци яны беларусы, ци литвины.

Некаторые вёски, напрыклад **Гайголи** и **Нова-Весь** згадзилися разсялицца на хутары, а другие ня хочуць. У нас тут пазавадзили ручные малатарни з Рыги; каштуюць па 90—100 руб. Пры рабоци двое людзей круцяць, адзин падае, а два адгортываюць. Займаюць мала мейсца, ды ня трэба каня. Круциць лягчэй, як сечкарню. **Жамбрыс.**

В. **Цацки** Белицкай вол. Лидзкаго п. Вилен. губ.—Ўжо трэци год, як мужыки тутэйшые выбрукавали вулицу сваей вёски каменьми. Хваляць, што надта добра цяпер, ня трэба мясиць балота, и скрозь стала чысьцей и харашэй. Брукаром заплацили 100 руб., а каменьня и пясок вазили сами. За Цацками сьледам пайшли и другие вёски, ды ўжо написали прыгавор и наняли брукара. Пачали работу ў в. **Нецеч**, и выходзиць им па 12 руб. на кожнаго гаспадара; брукуюць свае вулицы так сама вёски **Осово, Тобола, Жозяны.** Тобола ўжо скончыла брукаваць.

Ўстаюць па малу беларусы на свае ноги и сами працуюць, каб падняць культуру. Тольки бядуюць, што нима гдзе вучыць дзяцей, школак ў воласьци тольки адна—народная, а дзяцей да навуки ў кожнай вёсцы будзе па 30; прыдзе зима, и вёсковые дзеци замест навуки будуць сабак ганяць. Але мужыки стараюцца и сами наймаюць

вучыцелёў на зиму. Школки такие добра вучаць и па руску, и па польску, и тлумачыць им вучыцель усё ў роднай беларускай мове. Крыўда тольки дзецям ў тым, што такие школки называюць „тайными“ и закрываюць. У 1908 гаду начальства закрыла 4 школы такие ў Ганчарскай вол. ў вёсках Фальковичах, Минайтах, Песках и Заборцах, ды ешчэ 2 школки ў Белицкай вол. ў в. Нецеч и Чаплицы. **И. Калодка.**

В. **Фальковичы** Вилен. г. Лидзк. пав. Азимина и ярына слабые. Варыва трохи ад халадоў, што были ў чэрвеню (юни), аслабла. Азимина, што пасеяна па лубине, надта добра урадзила—лепш як па гнаю, за тое и цэна на лубин паднялася, каля нас плацяць па 60 кап. за пуд. **К.**

Г. **Слоним** Гродзенск. губ. Зимою у нас завяли стараньнем зубнога доктара Гольдбэрга суполку, каб памагаць бедным хлопцам, што вучацца ў школах. Записалася ў гэтае товарыство 200 членоў; кожны плациць па 1 руб. ў год. Ужо выдали 400 руб. для бедных хлапцоў на опратку, книжки и т. д. Добра было-бы, каб у нас па мястэчках завяли такие суполки. Некаторые бедные мужыки ня могуць пасылаць дзяцей у школу тольки таму, што нима як пракармиць их.

**Берэбендзя.**

Ў **Кастравицкай воласьци** Слонимскаго пав. Гродзен. губ. личыцца 8.269 душ. Есць тут 5 сельских народных вучылишч и 2 цэркоўные школы. Сельские школы поўна напханы вучэниками, але шмат дзяцей ўсё-ж таки ня маюць гдзе вучыцца. Тры вучыцели гэтых школ: Яроцки, Романович, Яговдзик и писар Грыц стараюцца, каб адкрыць ешчэ ў 6 вёсках, каторым далёка да вучылишча. Мужыки здаецца павинны были бы ничога не жалець, каб адкрыць такую карыстную рэч як школа. Але выходзиць не так, напрыклад, в. **Павловичы** ничога не захацела прыгаварыць на школу. В. **Василевичы** не захацела даць дзесяцины зямли пад вучылишчэ, дзеля таго астаецца без вучылишча для дзяцей. Хаця у нас ў Беларуси народны вучыцель и зациснены, як нигдзе, усёж вучыцели хочуць зрабиць библиотэку и чытальню для народа. Памажы Божэ! **Берэбендзя.**

З **Уцяны**, Вилкомирск. п., Ковенск. губ., пишуць ў литоўскую гвзэту „Viltis“, што тутэйшы земски начальник выдаваў старавером „пэрэселенчэские свидзецельства“ на выезд ў Сыбир. Але-ж ў дарози их затрымали и не пусьцили ехаць туды, а земскаго выдалили са службы.

**Выстаука у м. Ушачы.** 28 и 29 серпня (аўгуста) 1908 г. ў мястэчку *Ушачы*, Лепэльскаго павету, Витэбскай губ., Лепэльскае Товарыство Сельских Гаспадароў аткрывае *выстаўку сельскай гаспадарки, фабрычную и хатняго рэмесла (кустарную).* Товарыство просиць прылучыцца да выстаўки землеўладзельцоў, фабрыкантоў, сельских гаспадароў, мужыкоў, арэндароў, рэмесникоў, „кустароў“ и др. з усих гарадоў, мястэчэк и вёсак ўсяе Витэбскай губэрни, а так сама з паветоў Барысоўскаго, Дзисненскаго и Сенненскаго.

З гэтай выстаўки для ўсих жыцелёў нашаго краю будзе вяликая карысць: кожны ўбачыць, якие ёсць лепшые способы гаспадарки, рэмесла и т. д., дый можэ завясьци што добрае и у сябе. Дык, хто тольки мае што-колечы для выстаўки, нехай шле туды ўсё. За найлепшые рэчы будуць выдавацца награды.

За ўход на выстаўку плациць ня трэба. Вырабы и дабро мужыцкае, кали яно будзе стаяць пад голым небам (не ў „павильёнах“), прымаюцца на выстаўку без платы за мейсцо.

Да м. Ушач ад Полацку 40 вёрст, ад Лепля --35 в. и ад ст. Загатье Николаеўской (Бологое-Седлецкой) ж. д.—25 в.

Адрэс *Распорадзицельнаго Камитэту Выстауки* таки: почт. ст. **Воронеч,** Витэбскай губ., маёнтак *Воронеч.*

# * * Мужык. * *

Я—мужычы сынок.
Ни двара, ни кала!
Поле—жоўты пясок,
Хата ў землю вайшла.
Не жыву, а гнию,
Прападаю, як мыш...
Глянь на долю маю,
Глянь на цяжки мой крыж!
Я балоты сушу,
Надрываю жывот;
За безцэнак кашу,
Рыю землю, як крот.
Ўсе вуглы и куты
Сваим целам я зьмёў,
Ссек я лес и кусты
И дароги правёў;
Ды ня ежджу па их, —
Я хаджу пехатой
Ў рваных ботах, старых,
Часьцей босай нагой.
Збудаваў я палац,
Ўсяких фабрык, мастоў;
Сам жэ голы, як бац —
Пары дзьве лахманоў.
Пад ваконьнем не раз
Я з мяшэчкам хадзиў,
Миласьцины у вас
Хрыстом Богам прасиў.
Вы ж у торбу маю
Клали чэрствы кусок;
Замест рыбы—зьмяю
З сьмехам клали ў мяшок.
Мяне мочыць раса,
Мяне сонцэ пячэ,
И у песьнях маих
Сьлеза циха цячэ.
Я па сьвеци хадзиў,
Ўсюды косьци занёс,
Я на землю пралиў
Многа зьлёз, многа сьлёз!..
То ня дуб у бары
Заскрыпеў, застагнаў —
Гэта я без пары
Богу душу аддаў.
Нудна звоняць званы,
То мацней, то замруць;
Адзин дзяк ля труны, —
Гэта гроб мой нясуць.
На магилцы маей
Крыж трухлявы стаиць,
А над прахам касьцей
Вольны вецер шумиць...
Я—мужычы сынок,
Я ня маю дарог.
Мая школка—шынок,
Маё жыцьце—астрог!

**Якуб Колас.**

# З усих старон.

**Пецербург.** „Рада министроў“ 8-го липня пастанавила, што трэба завесьци новы закон, каб мацней караць за паруб и крадзеж чужога лесу. За гэтакие справы винаватых будуць судзиць як за крыминал — зладзейства. Дагэтуль кали винавайца верне ўладзельцу украдзенае дрэва ци заплациць за яго, дык справа ўся канчалася ничым; дый за паруб больш усяго накладали штраф. А па новаму закону, як ён будзе мець силу, кары будуць вяликие: садзиць будуць ў турму, як злодзеёў. Раней паруб лесу не личыли за крыминал, а глядзели на яго близка так сама, як и на шкоду ў поли.

= Вядомы ўсяму сьвету вялики писар расейски Лев Толстой написаў ў газэтах усяго сьвета пра кару сьмерци; ён даводзиў, што трэба палажыць канец гэтай страшэннай рэчы. Некольки газэт аштрафавали за тое, што яны гэта у сябе надрукавали. Ў Маскве „Русск. Вѣдом“. аштрафованы на тры тысячы рублёў.

Ў **Гадзячу** (на Украйне) за пагром жыдоўски чатырох пагромшчыкоў присудзили на год ў арэштанцкие роты, а 26 чал. — ў турму ад 4 да 8 месяцоў.

**З Каўказу.** Ня так даўно каўказки ваенна-акружны суд разбираў справу аб *„рэспублицэ у Сочи“*; абвиняемых было 109 чалавек, а сьведкаў на суд пакликали близка 700.

Сочи — гэта невялики горад на Каўкази, на берагу Чорнаго мора. Як видаць з „абвиницельнаго акта“, пасьля манифэсту 17 акцябра рэволюцыйные партии хацели завесьци тут новые парадки, аддаць ўсю власць ў руки самога народу, устанавиць „рэспублику“. Заведзены были новые суды; судзей выбираў ўвесь народ агульным, роўным, простым и тайным падаваньнем галасоў; ўсе были здаволены ими. Гэтые народные судзьи присудзили аднаго гарадавога, Шинкурэва, выслаць з гораду за тое, што ён падымаў народ на пагромы.

Ўсеми справами гораду и „рэспублики“ заведываў *Сэйм Народны* (свая Дума). Гэты Сэйм завёў народную милицию — як-бы свае войска, каторае было празначэно для начной ахраны. Ўсим жыцелём были дадзены роўные правы и поўная свабода. Выбрали асобную камисию, каб зрабиць „перапись“, кольки ўсяго ёсць народу ў „рэспублицэ“.

Начальства старое глядзела на ўсё гэта и ничога прашкодзиць не магло: яно мело пад сваей камандай ўсяго 23 салдатоў и 70 стражникоў. А тым часам рэволюционэры дастали некольки сотнёў винтовак са штыками, и народная милиция (войска) мела вяликую силу. И вось, у студню 1906 г., як стражники, каторые стаяли за старое начальства, хацели арэштаваць некольки рэволюционэроў, паднялося праўдзивае паўстаньне. Народнае войско напало на казённых салдатоў и стражникоў, а як тые схавалися ў лагеры и стали бараницца, дык рэволюционэры акружыли их и пачали абстрэливаць з винтовак и неякой старой гарматы. На трэци дзень начальник округу са сваей камандай паддаўся народу; салдатоў и афицэроў пусьцили зараз жэ на свабоду, а стражникоў и ўсю палицию ўзяли ў няволю и хацели выслаць з сваей старонки.

На чацьвёрты дзень правицельства прислала больш войска и ваенны карабль (контр-миноноску). Тады рэволюционэры, убачыўшы, што проци вялiкай силы ничога зрабиць не здалеюць, сами кинули бунтавацца и споўнили ўсё, чаго начальства ад их зажадало.

Новые парадки скончылись: ўсё нанова было заведзена, як даўней. *„Kur Lit.“*

# Пачтовая скрынка.

г. **Рыга Герману Гроссэту:** можэ вы вытлумачыце шырэй, чаму вы личыце беларусоў чыстакроўными „готами“.

**Радашковичы** Вилен. г. Вил. п. **Клешне:** 1) каб ведаць, як завясьци хаўрусную краму, выпишыце книжку з магазына Гиршоўскаго (ў Вильни, абок II-ой гимназии): *„Сельскiя и городскiя общественныя лавки и потребительныя товарищества. Какъ устроиться покупателям, чтобы имѣть все необходимое по дешевой цѣнѣ и хорошаго качества“. Составил Ѳ. Девель. Изд. II-ое Горбунова. Москва 1908 г. ц. 20 к.*— 2) як хаўрусам («артелью») вясьци гаспадарку, вучыць книжка:—*„Какъ надо устраивать крестьянское хозяйство, чтобы не было нужды и голода“. Сост. А. Модестовъ, ц. 10 коп. Москва 1908 г.*—3) як зрабиць сельски банчок, знойдзеце ў книзе: *„Гдѣ крестьянину достать за небольшой процентъ дѣнегъ для улучшенiя и оборота въ хозяйствѣ“. Сост. Кулижный ц. 5 коп. Москва 1908 г. изд. Горбунова.*

**Димитрово К. К.** — Камэдию „Валасны суд“ атрымали. Дзякуем. Скарыстаем, як будзем друкаваць разам некольки камэдий ў аднэй книжцэ.

**Лошницкая валасць** Барысоўскаго пав. Мин. г., **Банадысю:** аб градзе не друкуем, бо раней атрымали ад другога карэспондэнта.

ст. **Полочаны** Бол.-Седл. ж. д. **Цыпруку:** Хлопчыка з в. Литва, каторы любиць бадзяцца па сьвеци, не сядзиць дома, трэба паказаць доктару ци добраму педагогу.

**Радашковичы, Чытацелю:** на агрэсьце хвароба, кали ягады робяцца плюснявые, гэта ёсць эпидэмия, што годы 2—3, як узялась. Лекарства нима.

Вышли з друку и прадаюцца ў Канторы „Нашай Нивы“ дзьве новые беларуские книжки (выданьня Суполки „Загляне сонцэ и ў нашэ ваконцэ“) 1) **Жалейка — Янука Купалы** (цэна на простым паперы 50 кап., а на лепшым—80 кап.) и 2) **Smyk — M. Buraczka** (цэна 20 кап. и дарагое выданьне— 35 кап.).

Рэдактор-Выдаўца А. Ўласоў.

Друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 4.